**ЛЯДА́ШЦІК**, Ш э ў р а д з ь, П с у ц е н ь, варожы дух, які з-за нянавісці да людзей сурочвае іх, робіць хворымі, вар'ятамі, пазбаўляе свядомасці, ператварае ў жывёл. Л. ненавідзіць жанчын за тое, што яны нараджаюць дзяцей, і найбольш шкодзіць ім. Таму ўсе хваробы і нападкі беларусы прыпісвалі Л. Уяўлялі яго ў выглядзе пачвары, скрозь пакрытай рудымі валасамі, з крыламі і адным вокам у лобе. Вядомы быў у многіх мясцінах Беларусі, часам пад рознымі імёнамі. Адлюстраваны ў разнастайных нар. выразах: «З Лядашцікам спазнаўся — з розуму спаўся», «Лядашцікава вока» (г.зн. сурочлівае), «Лядашцік пераляцеў яму» (г.зн., ён страціў розум).

*Літ.*: Д р е в л я н с к и й  П. [Шпилевский П.]. Белорусские народные поверья // Журн. М-ва нар. просвещения. 1852. Лит. прибавление. №3.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



*Лядащцгк.*